# ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ



*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Галіна Пятроўна распавяла, як дружна спрацавалі яе вяскоўцы і падчас рамонту дахаў сваіх дамоў. Дапамагалі адзін аднаму сем'ямі.

— Для людзей па заяўках прывозіла на дом шыфер з раёна будаўнічая арганізацыя. Каму патрэбны — у наяўнасці і ў нашай краме спажыўтаварыства, ёсць таксама дастаўка, — дадае старшыня сельвыканкама. — Людзі адзін аднаму значна дапамаглі і ў рамонце агароджаў, бо вельмі шмат пашкоджанняў такога плану ў нас было.

На тэрыторыі гэтага сельсавета, сапраўды, шмат дзе была неабходна дапамога. Каб навесці парадак пасля стыхіі на сацыяльна значных аб'ектах, патрабаваліся і тэхніка, і працоўныя рукі.

— На тэрыторыі Мілашэвіцкай сярэдняй школы ўраган сарваў больш як сто лістоў шыферу. Дапамог аддзел адукацыі райвыканкама. Прывезлі матэрыялы, адрамантавалі ўсё апаратыўна, бо ў школе амаль ужо быў цалкам праведзены бягучы рамонт перад новым навучальным годам, і таму імкнуліся вельмі хутка ўстараніць нанесены будынку ўрон. Дзякуем і брыгадам энергетыкаў, якія прыязджалі да нас, бо было вельмі шмат прарываў сетак. Прыязджалі да нас і супрацоўнікі Белдзяржстраха: наведвалі ўсіх жыхароў, правяралі страхавыя выплаты, і ўжо цяпер іх людзі атрымліваюць праз паштовыя аддзяленні сувязі, — звярнула ўвагу Галіна Гаўрылавец.

## Работа працягваецца

Так, пасля стыхіі пацярпелых раёнаў — Лельчыцкі. У ліквідацыі наступстваў непагадзі тут актыўна ўдзельнічаюць усе дэпутаты сельскіх Саветаў дэпутатаў, райсавета.

— Урагану, падобнага таму, што абрынуўся на рэгіён 14 ліпеня, як кажуць нашы старажылы на вёсцы, сапраўды, і не згадаюць. У ліквідацыю наступстваў урагану ўключыліся актыўна ўсе, — падзякавала жыхарам свайго раёна **старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Таццяна БЯСПАЛАЯ.**

Ужо не аднойчы ў гэтыя дні лідар дэпутацкага корпуса раёна сама пераапранаецца ў рабочае і бярэцца дапамагаць у ліквідацыі наступстваў непагадзі. Напярэдадні Таццяна Адамаўна разам з супрацоўнікамі Лельчыцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, работнікамі камунальнай службы і вайскоўцамі выехалі наводзіць парадак на вясковых могілках у населеных пунктах Асенскія і Картынічы.

— Прыбіраюцца паваленыя дрэвы, аднаўляюцца зламаныя агароджы. Калі кожны асабістым удзелам робіць свой унёсак, тады і парадак наводзіцца хутчэй, — падкрэсліла Таццяна Бяспалая. — Сёння дапамога ў ліквідацыі наступстваў непагадзі працягваецца. Дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў аб'язджаюць пацярпелыя ад урагану населеныя пункты раёна, цікавяцца, чаго не хапае мясцовым жыхарам, якая патрэбна дапамога. Першачарговая ўвага — пажылым людзям, інвалідам, шматдзетным сем'ям



і адзінокім грамадзянам. Акрамя таго раённая вертыкаль, мясцовая ўлада на вёсцы, дэпутаты, сацыяльныя работнікі, прадстаўнікі працоўных калектываў працягваюць інфармаваць людзей, як ідзе ліквідацыя наступстваў стыхіі, што робіцца для гэтага ў раёне, — дадала старшыня райсавета дэпутатаў.

— Сустракаемся з людзьмі, імкнёмся быць з імі заўжды ў цяжкую хвіліну. Разам наводзім парадак на тэрыторыі сельсавета, на могілках і ў лесе. Шмат зроблена, і спагадлівыя аднавяскоўцы ў гэтым вельмі дапамаглі, за што ім асобная падзяка, — падзялілася **дэпутат Стадоліцкага сельскага Савета дэпутатаў Ніна ПРЫБАЛАВЕЦ.**

**Дэпутат Бараўскога сельскага Савета дэпутатаў Рыгор БАРЫСАВЕЦ** распавёў, як на іх тэрыторыі працягваюць працу па ліквідацыі наступстваў стыхіі. Ён разам з работнікамі Бараўской сярэдняй школы шчыра ўзяліся за працу на сацыяльна значным для вяскоўцаў аб'екце.

— На тэрыторыі школы былі паваленыя 32 дрэвы, пашкоджана 10 квадратных метраў даху, знішчана 30 метраў агароджы. Ніхто з работнікаў школы не застаецца ўбаку. Усе разам узяліся за ўборку. У чарговы раз выказваю падзяку ўсім, хто прымаў і прымае ўдзел у найцяжэйшай працы па ліквідацыі наступстваў стыхіі, — гаворыць Рыгор Барысавец.

## «Дзякуй, дзеткі»

Як звяртаюць увагу ў раёне, ліквідацыя наступстваў стыхіі на грамадскіх могілках і памятных месцах — цяпер адна з важных задач па ліквідацыі нанесенага ўрону. Адразу пасля здарэння жыхары населеных пунктаў былі заклапочаны, як давядзецца расчышчаць ад буралому месцы пахавання. Хтосьці змог прывесці ў парадак магілкі родных сваімі сіламі, але ў пераважнай большасці выпадкаў — неабходна была дапамога спецыялістаў. Да таго ж многія састарэлыя людзі не ў сілах справіцца з разборам буралому на пахаваннях, а да некаторых магіл увогуле ўжо няма і каму прыязджаць.

У населеных пунктах Лельчыцкага раёна да навядзення парадку на грамадскіх могілках падключыліся добраахвотнікі, працаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, вайскоўцы і ўсе неабыякавыя людзі. Адны з тых, хто падтрымаў акцыю — супрацоўнікі Тонежскай базавай школы і актывісты БРСМ, якія ўзяліся за навядзенне парадку на могілках у аграгарадку Тонеж. «Дзякуй, дзеткі», — толькі словы ўдзячнасці састарэлыя вяскоўцы перадаюць добраахвотным рупліўцам.

Прафсаюзны актыў Лельчыцкай раённай арганізацыі работнікаў адукацыі і навукі зладжана папрацаваў на ўборцы могілак у Лельчыцах. У аграгарадку Баравое Лельчыцкага раёна арганізавалі аднаўленчыя работы на могілках. Выйшлі працоўныя брыгады, у складзе якіх вайскоўцы.

І ў іншых раёнах Гомельшчыны непагадзь наявала свой бязлітасны «парадак» на месцах грамадзянскіх пахаванняў. Ад урагану ў рэгіёне ў цэлым пацярпела 912 могілак. Высокія аварыйныя дрэвы прыбіраюць спецтэхнікай, задзейнічаны прамысловыя альпіністы. На раніцу панядзелка 29 ліпеня каля 500 могілак былі ўжо ўпарадкаваны. Дапамагаюць у гэтай справе не толькі камунальныя службы раёнаў, але і супрацоўнікі лясгасаў, МНС, калектывы прадпрыемстваў, актывісты грамадскіх аб'яднанняў, дэпутаты, вайскоўцы і праваахоўнікі, моладзь.

Вайскоўцы 336 рэактыўнай артылерыйскай брыгады падключыліся да навядзення парадку ў Мазырскім раёне. Іх працоўны дэсант расчысціў ад паваленых дрэў месца пахавання ў аграгарадку Прудок. У Добрушы прыйшлі на дапамогу актывісты раённай арганізацыі ГА «Белая Русь». Выкарчаваныя дрэвы, заваленыя бураломам праходы паміж пахаваннямі, пашкоджаныя агароджы магіл: з такой «карцінай» на грамадскіх могілках «Лядцы» не захацелі мірыцца жыхары Добрушчыны. Значную работу па расчыстцы тэрыторыі правялі работнікі камунальнай службы, але каб справіцца з усім аб'ёмам аднаўленчых работ, дадатковыя працоўныя рукі былі вельмі дарэчы.

— Як неабыякавыя да роднага горада і яго жыхароў людзі, мы вырашылі дапамагчы, — падзяліліся актывісты, якія згуртаваліся на працу ў каманду з 12 чалавек.

Пашкоджаныя агароджы могілак, помнікі, крыжы, зламаныя дрэвы і галіны... У Гомелі неабыякавыя гараджане ўзялі на сябе значны аб'ём работ на могілках у Асаўцах. Яшчэ раней службы Гомельскага спецыялізаванага камбіната і супрацоўнікі МНС распілавалі пашкоджаныя і зламаныя дрэвы. Падчас акцыі добраахвотнікі расчысцілі тэрыторыю могілак і прылеглую частку.

Ва ўсіх пацярпелых раёнах Гомельскай вобласці — у ліку актыўных добраахвотных памочнікаў ліквідацыі наступстваў стыхіі — супрацоўнікі праваахоўных органаў рэгіёна. Яны забяспечваюць правапарадак на пацярпелых тэрыторыях і расчышчаюць ад буралому тэрыторыі населеных пунктаў. Праваахоўнікі дапамагаюць з аднаўленчымі работамі як арганізацыям, так і мясцовым жыхарам: ладзяць агароджы, убіраюць паваленыя дрэвы на прысядзібных участках, месцах агульнага карыстання, могілках.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Лельчыцкай раённай газеты «Светлае жыццё».**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

**e-mail: info@zviazda.by**

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12.119.** **Нумар падпісаны ў 19.30 30 ліпеня 2024 года.**